Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б і абласнога выканаўчага камітэта

Год выдання другі

№ 256 (325)
НЯДЗЕЛЯ
3
ЛІСТАПАДА
1940 г.

Цэна 10 капеек.

Учора на многалюдных сходах на фабрыках, заводах і ўстановах Беластоцкай вобласці пачалося вылучэнне кандыдатаў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

Працоўныя вылучаюць самых лепшых, адданых партыі ЛЕНІНА-СТАЛІНА людзей у мясцовыя органы ўлады

КАНДЫДАТЫ СТАЛІНСКАГА БЛОКА КОМУНІСТАЎ І БЕСПАРТЫЙНЫХ

Кампанія па выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных уступіла ў самы адказны перыяд—пачалося вылучэнне кандыдатаў. Учора на прадпрыемствах вобласці адбыліся сходы рабочых і служачых, прысвечаныя вылучэнню кандыдатаў у абласны, гарадскія і раённыя Советы дэпутатаў працоўных. Як сведчаць друкуемыя ў сённяшнім нумары паведамленні, агульныя сходы праходзяць з вялікім палітычным уздымам. Працоўныя вылучаюць кандыдатамі ў Советы лепшых сыноў і дачок соцыялістычнай радзімы.

Працоўныя нашай вобласці на падставе артыкула 116 Канстытуцыі БССР і артыкулаў 68 і 69 Палажэння аб выбарах у абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных ажыццяўляюць свае найвялікшыя правы грамадзян Совецкага Саюза, вылучаюць у Советы дэпутатаў працоўных сваіх дастойных людзей, заваяваўшых самаадданай працай на карысць соцыялістычнай радзімы давер'е народа; вылучаюць людзей, для якіх інтарэсы радзімы стаяць вышэй усяго на свеце.

Права выстаўлення кандыдатаў—гаворыць Палажэнне аб выбарах у мясцовыя Советы,—забяспечваецца за грамадскімі арганізацыямі і таварыствамі працоўных: комуністычнымі партыйнымі арганізацыямі, прафесіянальнымі саюзамі, кааператывамі, арганізацыямі моладзі, культурнымі таварыствамі і іншымі арганізацыямі, зарэгістрыраванымі ва ўстаноўленым законам парадку. Права выстаўлення кандыдатаў ажыццяўляюць як цэнтральныя органы грамадскіх арганізацый і таварыстваў працоўных, так і іх рэспубліканскія, абласныя і раённыя органы, таксама як агульныя сходы рабочых і служачых на прадпрыемствах і ўстановах, чырвонаармейцаў—па вайсковых часцях, а таксама агульныя сходы сялян па калгасах, рабочых і служачых соўгасаў—па соўгасах.

Гэтыя сапраўды дэмакратычныя правы ў вылучэнні кандыдатаў народам, яго грамадскімі арганізацыямі забяспечваюцца толькі ў нашай соцыялістычнай краіне, дзе дзейнічае вялікі сталінскі закон — Канстытуцыя СССР.

У нашай краіне ўжо стала традыцыяй, што кандыдатамі ў Советы дэпутатаў працоўных вылучаюцца дастойныя прадстаўнікі блока комуністаў і беспартыйных. Комуністаў таму, што «найбольш актыўныя і свядомыя грамадзяне з радоў рабочага класа і іншых слаёў працоўных еднаюцца ва ўсесаюзную комуністычную партыю (большэвікоў), якая з'яўляецца перадавым атрадам працоўных у іх барацьбе за ўмацаванне і развіццё соцыялістычнага ладу і якая з'яўляецца кіруючым ядром усіх арганізацый працоўных як грамадскіх, так і дзяржаўных». Беспартыйных таму, што «партыя большэвікоў не адгараджваецца ад беспартыйных, а наадварот, ідзе на выбары ў блоку, у саюзе з беспартыйнымі, ідзе ў блоку з прафесіянальнымі саюзамі рабочых і служачых, з комсамолам і іншымі арганізацыямі і таварыствамі беспартыйных».

Інтарэсы партыі большэвікоў з'яўляюцца інтарэсамі ўсяго совецкага народа. У асобе партыі Леніна—Сталіна совецкі народ мае свайго правадыра, арганізатара ўсіх сваіх сіл. Комуністычная партыя паслядоўна і няўхільна ажыццяўляе ўсе заветныя імкненні народа, ведучы яго да ззяючых вяршынь комунізма. Вялікія перамогі Кастрычніцкай рэволюцыі, разгром ворагаў народа ў нашай краіне, пабудова соцыялізма, стварэнне новага совецкага народа дзе няма месца эксплаататарам, дзе ўсе грамадзяне—працоўныя, дзе ва ўсяго народа адзін агульны інтарэс; дасягненне сапраўднага маральнага і палітычнага адзінства совецкага народа, якое цяпер з'яўляецца асновай нашага соцыялістычнага грамадства,—вось аснова блока, саюза комуністаў і беспартыйных.

Працоўныя заходніх абласцей на выбарах у Вярхоўныя Советы СССР і БССР прадэманстравалі сваё палітычнае і маральнае адзінства, сваю згуртаванасць вакол вялікай партыі Леніна—Сталіна, аддаўшы свае галасы за кандыдатаў народа, кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных. На выбарах у мясцовыя Советы працоўныя нашай вобласці яшчэ раз прадэманстрыруюць сваю адданасць соцыялістычнай радзіме, вялікаму совецкаму народу, вылучаючы кандыдатамі ў Советы дастойных прадстаўнікоў народа — партыйных і непартыйных большэвікоў, выбраннем іх дэпутатамі ў Советы.

Рабочыя, служачыя і совецкая інтэлігенцыя зусім правільна робяць, калі кандыдатамі ў Советы адбіраюць і вылучаюць людзей, якія на справе з'яўляюцца большэвікамі-барацьбітамі за новыя перамогі соцыялізма, за высокую прадукцыйнасць працы, якія даюць узоры большэвіцкай дысцыпліны і комуністычных адносін да працы, якія з'яўляюцца палкімі патрыётамі соцыялістычнай радзімы і не маюць ніякай літасці да ворагаў. У ліку вылучаных кандыдатаў мы маем людзей, якія нястомна змагаліся за вызваленне працоўных з-пад іга капіталістаў і памешчыкаў, якія паказалі сябе барацьбітамі за ўмацаванне совецкай улады ў заходніх абласцях БССР.

З вялікім палітычным уздымам праходзяць сходы па вылучэнню кандыдатаў у Советы дэпутатаў працоўных. З'яднаны народ пад сцягам партыі Леніна—Сталіна на выбарах у мясцовыя Советы прадэманстрыруе свае сілы, сваю гатоўнасць усямерна ўмацоўваць і абараняць соцыялістычную радзіму.

Вылучаныя кандыдаты з'яўляюцца дастойнымі прадстаўнікамі народа.

Няхай жыве непераможны сталінскі блок комуністаў і беспартыйных на выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных!

Кандыдаты педінстытута

175 студэнтаў, выкладчыкаў і тэхработнікаў Беластоцкага педагагічнага інстытута сабраліся 2 лістапада на мітынг, прысвечаны вылучэнню кандыдатаў у дэпутаты абласнога і гарадскога Советаў дэпутатаў працоўных.

Слова атрымлівае студэнт літфака тав. Аб'езчыкаў.

— Я прапаную,—гаворыць ён,—вылучыць кандыдатам у дэпутаты абласнога Совета нашага дацэнта тав. Ферэнцовіча Генрыха Фларэнцінавіча. Яшчэ ў годы панавання памешчыкаў і капіталістаў тав. Ферэнцовіч быў верным сынам працоўнага народа, прагрэсіўным педагогам, які не шкадаваў сваіх сіл для народнай асветы. Працуючы ў нашым інстытуце, тав. Ферэнцовіч праявіў сябе як чулы і патрабавальны педагог, здольны навуковы работнік, актыўны грамадчык. Ён будзе дастойным нашым кандыдатам.

Кандыдатуру тав. Ферэнцовіча горача падтрымалі ў сваіх выступленнях выкладчыкі інстытута праф. Любельскі і тав. Ліндэнбаум.

На мітынгу прынята аднадушнае рашэнне вылучыць тав. Ферэнцовіча кандыдатам у дэпутаты абласнога Совета па 1-й Ленінскай выбарчай акрузе. Калектыў педінстытута звярнуўся з заклікам да выбаршчыкаў гэтай акругі галасаваць за тав. Ферэнцовіча.

Затым пачынаецца вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты гарадскога Совета. Студэнтка тав. Кузняцова прапануе кандыдатуру дырэктара інстытута тав. Краўчанка Івана Сяргеевіча.

— Тав. Краўчанка,—гаворыць яна,—украінец па нацыянальнасці, выхадзец з бядняцкай сялянскай сям'і. З маладых год ён звязаў сваё жыццё з барацьбой за справу Леніна—Сталіна. Член ВКП(б) з 1920 года, тав. Краўчанка працаваў на многіх адказных пасадах.

Кандыдатуру тав. Краўчанка падтрымаў парторг інстытута тав. Пілюцін.

Мітынг аднагалосна вылучыў тав. Краўчанка кандыдатам у дэпутаты гарадскога Совета па 120 выбарчай акрузе.

Студэнт тав. Грынец прапануе кандыдатуру лепшай студэнткі-выдатніцы, комсамолкі тав. Налівайка Ольгі Андрэеўны.

— Тав. Налівайка, беларуска па нацыянальнасці, нарадзілася ў 1918 годзе ў сям'і селяніна-бедняка. За час вучобы ў педінстытуце тав. Налівайка праявіла сябе як лепшая студэнтка-выдатніца, актыўная комсамолка.

Выступіўшыя затым тт. Данільчык і Пілюцін падтрымалі кандыдатуру тав. Налівайка, ахарактарызаваўшы яе як дастойнага прадстаўніка совецкага студэнцтва ў гарадскі Совет.

Тав. Налівайка аднадушна вылучаецца кандыдатам па 119 выбарчай акрузе.

Сакратар комсамольскага камітэта інстытута тав. Малочка прапануе кандыдатуру тав. Сямёнава Гаўрыіла Іванавіча, сакратара Беластоцкага абкома КП(б)Б. Мітынг аднадушна вылучае тав. Сямёнава кандыдатам у дэпутаты гарадскога Совета і просіць яго даць згоду балатыравацца па 121 выбарчай акрузе.

Па прапанове выкладчыка інстытута тав. Міхейчыка, падтрыманай тав. Бургіным, калектыў педінстытута вылучыў кандыдатам у дэпутаты гарадскога Совета тав. Шпілёва Паўла Прохаравіча—загадчыка Беластоцкага горгандальаддзела — па 122 выбарчай акрузе.

На мітынгу выбраны давераныя тт. Міхейчык, Літвін, Клаўзнер, Лашэвіч і Бузук, а таксама 10 упаўнаважаных на перадвыбарчы сход.

Рабочыя і служачыя дэпо вылучылі 7 кандыдатаў

Ажыўлена прайшоў перадвыбарчы сход рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых Беластоцкага чыгуначнага дэпо. Прысутнічала 450 чалавек.

Пасля кароткай уступнай прамовы начальніка палітаддзела Беластоцкага аддзялення тав. Паліцана пачалося вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты абласнога і гарадскога Советаў дэпутатаў працоўных. Сакратар партыйнай арганізацыі дэпо тав. Бабакін уносіць прапанову вылучыць кандыдатам у дэпутаты абласнога Совета лепшага памочніка машыніста Люцыяна Іванавіча Партынскага.

— Тав. Партынскі яшчэ малады,—гаворыць тав. Бабакін.—Ён нарадзіўся ў 1912 годзе. Але яму ўжо давялося многае перажыць. 8 год ён прасядзеў у турме, адкуль яго вызваліла Чырвоная Армія. Пры совецкай уладзе тав. Партынскі стаў чыгуначнікам, аб чым ён марыў з дзіцячых год. Не маючы ніякай спецыяльнасці, ён быў прыняты у Беластоцкае дэпо ў якасці чорнарабочага. Але тав. Партынскі сур'ёзна ўзяўся за вучобу. Ён хутка стаў слесарам. Потым яго накіравалі на курсы памочнікаў машыністаў. Гэтую справу тав. Партынскі асвоіў за 4 месяцы. Працуючы памочнікам машыніста, ён паказвае ў дэпо добрыя прыклады ў рабоце.

Кандыдатуру тав. Партынскага падтрымаў у сваім выступленні рабочы тав. Купін.

Сход пастанавіў аднагалосна — вылучыць тав. Л. І. Партынскага кандыдатам у дэпутаты абласнога Совета па выбарчай акрузе № 8.

Затым адбылося вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты Беластоцкага гарадскога Совета дэпутатаў працоўных. З прапановамі выступілі машыніст-інструктар тав. Гардзей, машыніст т. Папоў, электразваршчык тав. Пульны, газазваршчык т. Мацэйка і іншыя, якія ў лік кандыдатаў прапанавалі вылучыць лепшых сваіх прадстаўнікоў—верных сыноў і дачок нашай радзімы. Аднадушным галасаваннем вылучаны кандыдатамі ў дэпутаты гарадскога Совета: машыніст дэпо тав. С. В. Остасевіч (па выбарчай акрузе № 197), машыніст тав. П. І. Кас'яновіч (па выбарчай акрузе № 194), машыніст тав. О. Н. Бертава (па выбарчай акрузе № 193), начальнік дэпо А. Д. Шакальская (па выбарчай акрузе № 195), сакратар партыйнай арганізацыі тав. К. А. Бабакін (па выбарчай акрузе № 196) і намеснік старшыні Беластоцкага горвыканкома тав. П. Я. Сенькевіч (па выбарчай акрузе № 106).

Сход выбраў даверанымі тт. Паўлава, Проліна, Еўтушэнка, Сарокіна, Ільіна і Шаўцова.

Упаўнаважанымі на акруговую перадвыбарчую нараду выбрана 33 чалавекі.

Рабочыя і служачыя дэпо звярнуліся да ўсіх выбаршчыкаў акруг №№ 8, 194, 197, 193, 195, 196 і 106 з заклікам аддаць свае галасы за вылучаных ад дэпо кандыдатаў у дэпутаты абласнога і гарадскога Советаў.

В. Дзям'янаў.

На сходзе рабочых плюшавай фабрыкі

(Прысутнічала 350 чалавек).

Сход рабочых плюшавай фабрыкі, прысвечаны вылучэнню кандыдатаў у дэпутаты мясцовых органаў улады, адкрыў старшыня фабрычнага камітэта тав. Пятроўскі.

Слова бярэ начальнік ткацкага цэха тав. Керэз. Ён прапануе вылучыць кандыдатам у дэпутаты абласнога Совета старага ткача Сцяпана Станіслававіча Ленартоўскага.

Тав. Ленартоўскі прайшоў багаты жыццёвы шлях, шлях ткача, аддаўшага сябе рэволюцыйнай барацьбе. 40 год ён працуе на вытворчасці. Неаднаразова яго арыштоўвалі за рэволюцыйную дзейнасць. У 1927 годзе рабочыя Лодзі вылучылі яго кандыдатуру ў магістрат, але ён не быў выбран: яго арыштавалі і выпусцілі толькі пасля выбараў. Так распраўляліся капіталісты з прадстаўнікамі рабочага класа. Працуючы на плюшавай фабрыцы, тав. Ленартоўскі паказаў сябе добрым стаханаўцам, сістэматычна перавыконваючым вытворчую праграму. Ён прымае актыўны ўдзел у грамадскім жыцці фабрыкі, з'яўляецца старшынёй цэхавага камітэта.

Выступаўшыя падтрымалі прапанову тав. Керэза аб вылучэнні тав. Ленартоўскага кандыдатам у дэпутаты ў абласны Совет дэпутатаў працоўных. Яго вылучылі па Совецкай выбарчай акрузе.

Затым выступае памочнік майстра фарбавальна-апрэтурнага цэха тав. Пісарэвіч. Ён прапануе вылучыць старшыню фабрычнага камітэта Вацлава Міхайлавіча Пятроўскага кандыдатам у дэпутаты гарадскога Совета. Прысутныя горача адабраюць прапанову тав. Пісарэвіча.

Ткачыха Вераніка Ярдзях прапануе вылучыць кандыдатам у дэпутаты гарадскога Совета стаханаўку тав. Максімовіч.

На сходзе кандыдатамі ў дэпутаты гарадскога Совета вылучаны тт. Кузняцоў, Кандрацкая, Альшэўскі, Рудзінскі, Петручук і Гальперын.

Выступіўшы тав. Ленартоўскі горача дзякаваў рабочых фабрыкі за аказанае яму давер'е.

Сход прыняў зварот да выбаршчыкаў тых выбарчых акруг, дзе будуць балатыравацца вылучаныя рабочымі плюшавай фабрыкі кандыдаты ў дэпутаты ў мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

Сход выбраў 8 даверaных асоб і 20 упаўнаважаных на акруговы перадвыбарчы сход.

Кандыдаты—перадавыя людзі вытворчасці

Прама з работы прышлі рабочыя і работніцы 1-га беластоцкага тэкстыльнага камбіната на сход, прысвечаны вылучэнню кандыдатаў у дэпутаты ў абласны і гарадскі Советы дэпутатаў працоўных. Памяшканне клуба перапоўнена. Сход адкрыла намеснік старшыні фабкома тав. Дзіновіч. Рабочы тав. Неплашчук прапануе кандыдатам у дэпутаты ў Беластоцкі абласны Совет дэпутатаў працоўных вылучыць прадзільшчыцу-стаханаўку тав. Сцепаніду Васільеўну Жыўлюк. Гэта прапанова сустракаецца апладысментамі. Выступаючыя тт. Гольдберг і Дзежац каротка характарызуюць кандыдатуру тав. Жыўлюк.

Сцепаніда Васільеўна прайшла цяжкі жыццёвы шлях жанчыны ў капіталістычнай Польшчы. Яна нарадзілася ў сям'і пастуха ў вёсцы Едзічы, Крынкаўскага павета. Беднасць сям'і і голад прымусілі маладую дзяўчыну пакінуць вёску і пайсці ў горад шукаць кавалка хлеба. Але і горад сустрэў яе непрыязна. Яна паступіла хатняй прыслугай да адваката. У 1930 годзе Сцепаніда Васільеўна пайшла сезонніцай на ткацкую фабрыку. Працаваць прыходзілася ў жудасных умовах. Эксплаатацыя была невыноснай.

Толькі совецкая ўлада, Чырвоная Армія далі Сцепанідзе Васільеўне радасць жыцця, разнявалілі яе вытворчыя і арганізацыйныя здольнасці. На камбінаце яна карыстаецца вялікім аўтарытэтам сярод рабочых і работніц. Яна першая перайшла на ўшчыльненую работу і замест 500 верацён абслугоўвае тысячу верацён. Тав. Жыўлюк прымае актыўны ўдзел у грамадскай рабоце.

Рабочыя просяць тав. Сцепаніду Васільеўну Жыўлюк даць сваю згоду балатыравацца па Беластоцкай Фабрычнай выбарчай акрузе па выбарах у абласны Совет.

Рабочы Клейф прапанаваў вылучыць кандыдатам у дэпутаты ў гарадскі Совет дэпутата Вярхоўнага Совета БССР былую работніцу камбіната Марыю Канстанцінаўну Пятроўскую. Сход аднагалосна падтрымаў прапанову тав. Клейф.

Кандыдатамі ў дэпутаты ў Беластоцкі гарадскі Совет таксама вылучаны тт. Альбіна Федасюк, Радзішэўскі, Стоцкая (сакрэтчыца прадзільнага цэха), Барташук, Канопка, малады рабочы, комсамолец, чатырохстаночнік тав. Цікоцкі і нарміроўшчыца аддзелачнага цэха Ізабела Андрэеўна Якубоўская.

Вылучаныя кандыдаты з'яўляюцца лепшымі рабочымі 1-га камбіната, актыўнымі грамадскімі работнікамі. Тав. Канопка—адзін з лепшых агітатараў камбіната. Рабочыя з вялікай цікавасцю слухаюць яго гутаркі аб міжнародных падзеях, аб вялікіх поспехах краіны соцыялізма. Ён заўсёды рабочым гаворыць праўду. Польскія ўлады за праўду, якую ён гаварыў рабочым, саджалі яго ў турмы,. дзе ён прасядзеў чатыры годы.

Кандыдаты ў дэпутаты мясцовых Советаў ад 1-га тэкстыльнага камбіната з'яўляюцца кандыдатамі блока комуністаў і беспартыйных, чэснымі грамадзянамі нашай краіны, адданымі вялікай справе партыі Леніна—Сталіна.

П. Дудо.

Мы маем права выбіраць і быць выбранымі

Роўна ў 2 гадзіны 30 мінут сабраліся рабочыя першай змены 5-га тэкстыльнага камбіната на сход, прысвечаны вылучэнню кандыдатаў у дэпутаты абласнога і гарадскога Советаў.

Слова бярэ начальнік ткацкага цэха тав. Несцярэнка. Ён прапануе вылучыць кандыдатам ў дэпутаты абласнога Совета Зігмунда Пятровіча Каецкага, па нацыянальнасці паляка, беспартыйнага. У панскай Польшчы тав. Каецкі прымаў актыўны ўдзел у профрабоце, абараняў інтарэсы рабочых. Пасля прыходу Чырвонай Арміі працуе на камбінаце. Цяпер ён працуе намеснікам начальніка ткацкага цэха. Дзякуючы добрасумленнай, упорнай рабоце, яго цэх стаў адным з перадавых на камбінаце.

Рабочы калектыў аднагалосна падтрымаў кандыдатуру тав. Каецкага.

Тав. Бабакова прапануе вылучыць кандыдатам у дэпутаты гарадскога Совета тав. Бэза Майсея — лепшага стаханаўца-двухстаночніка, брыгадзіра комсамольскай маладзёжнай брыгады. Тав. Бэз адзін з першых на камбінаце перайшоў працаваць на два станкі. Ён з'яўляецца актыўным комсамольцам, членам пленума гарадскога камітэта комсамола. Яму 20 год. Па канстытуцыі капіталістычных краін такія маладыя не мелі права галасаваць і быць выбранымі ў магістрат, як і ў іншыя органы ўлады. Толькі пры совецкай уладзе юнакі і дзяўчаты ад 18-гадовага ўзросту атрымалі гэтае права. Тав. Бэз з'яўляецца дастойным кандыдатам і апраўдае давер'е свайго калектыва.

Затым вылучаюцца: работніца апаратна-прадзільнага цэха тав. Зубрыцкая, тав. Вальчук Станіслаў актыўны ўдзельнік у рэволюцыйных стачках у панскай Польшчы, Сакалоўская — вінтаўшчыца прадзільнага цэха і сакратар гарадскога камітэта партыі тав. Міlоў.

А. Стасенка.

ВЕРНЫЯ СЫНЫ І ДОЧКІ НАРОДА

Сход рабочых і служачых 3-га суконнага камбіната, (прысвечаны вылучэнню кандыдатаў у дэпутаты гарадскога Совета дэпутатаў працоўных, адкрыў сакратар партарганізацыі тав. Тарасуль. Першай выступае з прамовай член фабкома тав. Хейман.

— Я прапаную, — гаворыць тав. Хейман, — вылучыць ад нашага калектыва кандыдатам для балатыравання ў дэпутаты гарадскога Совета лепшага нашага рабочага, актыўнага грамадскага работніка тав. Міхалоўскага Пятра Вікенцевіча. Зараз тав. Міхалоўскі з'яўляецца старшынёй фабрычнага камітэта, ён чэсна і аддана працуе на дабро соцыялістычнай радзімы.

Ткач-стаханавец тав. Клас выступае з прапановай вылучыць кандыдатам у дэпутаты гарадскога Совета рабочага-вылучэнца, намесніка начальніка ткацкага цэха тав. Пісарэвіча Владзіслава Людвігавіча. Тав. Пісарэвіч, удзельнік славутай шасцімесячнай стачкі плюшавікоў Беластока, быў членам камітэта.

Выступае тав. Еліна і прапануе ад імені калектыва вылучыць кандыдатам у дэпутаты актыўную грамадскую работніцу, лепшага агітатара, лабарантку камбіната тав. Петрак Галіну Іосіфаўну. Тав. Еліна характарызуе Галіну Іосіфаўну як верную дачку народа, якая прасядзела 6 год у польскіх турмах за рэволюцыйную работу.

Комсамолец-ткач тав. Асавіцкі выносіць прапанову для вылучэння кандыдатам у дэпутаты лепшую работніцу, чысцільшчыцу сураўя тав. Зарэмскую Любу Мордухаўну. Тав. Зарэмская на рабоце паказвае лепшыя ўзоры, захапляе перадавым прыкладам сваіх таварышак.

Тав. Якубовіч прапануе вылучыць кандыдатам у дэпутаты гарадскога Совета тав. Ражноўскага Івана Вікенцевіча, які зараз працуе старшынёй Беластоцкага горвыканкома.

Сход з радасцю і поўным аднадушшам адобрыў кандыдатуры, якія заслужылі справамі вялікае давер'е быць народнымі выбраннікамі. Сход выбраў таксама даверaных асоб для агітацыі за сваіх кандыдатаў і дэлегатаў на гарадскі сход упаўна[illegible]

Вылучэнне кандыдатаў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных

Вылучылі лепшых людзей

Пасля заканчэння работы рабочыя першай змены 4-га беластоцкага тэкстыльнага камбіната сабраліся на сход, прысвечаны вылучэнню кандыдатаў у дэпутаты Беластоцкага гарадскога Совета.

Слова для прапановы атрымала старшыня фабкома тав. Цобена.

— Нам, таварышы,—заявіла яна,—трэба вылучыць у мясцовыя Советы такіх людзей, якія-б заслугоўвалі поўнага давер'я народа. Я прапаную вылучыць кандыдатам у дэпутаты гарадскога Совета тав. Галецкага Іосіфа Іосіфавіча, старага кадравага рабочага. Тав. Галецкі паходзіць з рабочай сям'і. Ён актыўны грамадчык, з'яўляецца членам фабкома.

Майстар ткацкага цэха, вылучэнец тав. Сідаровіч прапануе вылучыць кандыдатам у дэпутаты гарадскога Совета тав. Плонскага Якава Іоселевіча, лепшага стаханаўца, які адзін з першых рабочых прадпрыемства перайшоў на абслугоўванне двух станкоў. Зараз ён працуе на чатырох станках.

— Тав. Плонскі,—усхвалявана гаворыць тав. Сідаровіч,—прайшоў цяжкую школу жыцця ў панскай Польшчы. Многа год працаваў у ланкетнікаў, доўгі час быў беспрацоўным. Пасля нацыяналізацыі беластоцкай тэкстыльнай прамысловасці ён паступіў на работу на наш камбінат. Тав. Плонскі актыўна ўдзельнічае ў грамадскім жыцці: ён працуе членам вытворча-масавай камісіі і профоргам.

Затым пад агульнае адабрэнне прысутных намеснік старшыні фабкома тав. Макаль называе кандыдатуру ў дэпутаты гарадскога Совета вылучэнкі, начальніка перадавога апаратна-прадзільнага цэха камбіната тав. Еўгеніі Сяргееўны Антаненка, члена фабкома.

Слова ўзяла сакратар партыйнай арганізацыі камбіната тав. Ваверняк.

— Таварышы!—сказала яна.— Я прапаную вылучыць кандыдатам у дэпутаты Беластоцкага гарадскога Совета дэпутатаў працоўных тав. АляксандраАнуфрыевіча Кільбіна, вернага большэвіка, сакратара Беластоцкага абкома партыі. Тав. Кільбін ужо многа год на адказнай партыйнай рабоце і ўсюды, дзе ён працаваў, карыстаўся вялікім давер'ем працоўных.

Намеснік дырэктара камбіната тав. Сытоў горача падтрымаў прапанову тав. Ваверняк.

— Няма сумнення, — сказаў ён,—што чалавек, якому наша комуністычная партыя даручыла кіруючую адказную партыйную работу, варты нашага давер'я.

Аднадушным рашэннем сход вылучыў кандыдатамі ў дэпутаты Беластоцкага гарадскога Совета дэпутатаў працоўных тт. Галецкага, Плонскага, Антаненка і сакратара Беластоцкага абкома партыі тав. Кільбіна.

Затым сход аднадушна выбірае даверанымі асобамі тт. Новікава, Трушыну, Раткевіча і Хагінскага.

Выбрана таксама 20 упаўнаважаных на перадвыбарчы сход.

Дастойныя кандыдаты

Па сканчэнні работы першай змены рабочыя, служачыя і інжынерна-тэхнічныя работнікі 6-га тэкстыльнага камбіната сабраліся ў клубе.

Сакратар партарганізацыі тав. Рубінштэйн адкрывае сход, прысвечаны вылучэнню кандыдатаў у абласны і гарадскі Советы дэпутатаў працоўных, пасля чаго першым узяў слова ткач-двухстаночнік тав. Шмуклер. Ён гаворыць:

— Тав. Курыльскі Ізраель, рабочы нашага камбіната, з'яўляецца лепшым стаханаўцам-двухстаночнікам. Ён стары рабочы-ткач, ініцыятар стаханаўскага руху на нашым камбінаце. Я вылучаю яго кандыдатам у дэпутаты абласнога Совета па 5-й Цэнтральнай выбарчай акрузе. Тав. Курыльскі апраўдае наша давер'е, ён дастойны быць выбраннікам народа.

Прапанова тав. Шмуклера сходам сустракаецца аднадушным адабрэннем.

Выступіўшы затым дырэктар камбіната тав. Гімпельсон прапанаваў вылучыць кандыдатам у гарадскі Совет Віталія Раманавіча Раманава — сакратара Беластоцкага гаркома КП(б)Б.

— Тав. Раманаў з'яўляецца сынам рабочага, сам рабочы-малатабоец, ён доўгі час працуе на кіруючай партыйнай рабоце, праявіў сябе як стойкі большэвік, дастойны член вялікай партыі Леніна—Сталіна. Будучы дэпутатам гарадскога Совета, ён таксама апраўдае наша давер'е. Я вылучаю яго кандыдатам у дэпутаты гарадскога Совета.

Прапанова тав. Гімпельсона сустракаецца адабрэннем і дружнымі апладысментамі ў чэсць вялікай партыі Леніна—Сталіна.

Кандыдатамі ў гарадскі Совет дэпутатаў працоўных вылучаны знатныя людзі камбіната стаханаўка-матальшчыца Вера Ражко, галоўны інжынер тав. Кавалеўская, старшыня фабрычнага камітэта тав. Пшэбыляк, дырэктар камбіната тав. Гімпельсон.

Агульны сход калектыва 6-га камбіната аднагалосна падтрымаў вылучаныя кандыдатуры і ў прынятай пастанове просіць таварышоў **Курыльскага, Раманава, Ражко, Пшэбыляк, Кавалеўскую і Гімпельсона** даць сваю згоду балатыравацца ў дэпутаты ў абласны і гарадскі Советы дэпутатаў працоўных.

Сход заклікаў свой актыў павесці шырокую агітацыйную работу на выбарчым участку, а ўсіх выбаршчыкаў—прыняць самы актыўны ўдзел у галасаванні за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных.

С. Кубышкіна.

У абкоме КП(б)Б

Нарада загадчыкаў аддзелаў прапаганды і агітацыі райкомаў партыі

Беластоцкі абком КП(б)Б 1 лістапада правёў нараду загадчыкаў аддзелаў прапаганды і агітацыі райкомаў партыі. На нарадзе прысутнічалі таксама прапагандысты і загадчыкі парткабінетаў.

На павестцы дня стаяла пытанне аб абмене вопытам у агітацыйна-масавай рабоце ў сувязі з падрыхтоўкай да выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

З дакладамі выступілі загадчыкі аддзелаў прапаганды і агітацыі Граеўскага і Кольнаўскага райкомаў партыі.

У сваім дакладзе загадчык аддзела прапаганды і агітацыі Граеўскага райкома партыі тав. Царэў спыніўся на прароблепай рабоце ў сувязі з падрыхтоўкай да выбараў.

— Па ўсіх сельсоветах, прадпрыемствах і ўстановах, — гаворыць ён,—праведзены мітынгі і сходы, на якіх прысутнічала 21.178 чалавек. У раёне створана 275 гурткоў па рабоце з насельніцтвам, якімі ахоплена 2.174 выбаршчыкі. Аднак яшчэ не ўсе выбаршчыкі ахоплены гурткамі па вывучэнню Канстытуцыі і выбарчага закона. У раёне праведзены семінары агітатараў. Мы падабралі 289 добрых агітатараў і бяседчыкаў, прыцягнулі да агітацыйна-масавай работы 979 чалавек з мясцовага насельніцтва. Гэтыя таварышы праводзяць гутаркі на польскай і яўрэйскай мовах.

Агітатар чыгуначнага агіткалектыва тав. Корсун правёў 8 заняткаў, тав. Магілка—5 заняткаў. Таварышы Ясінскі і Грабоўскі, Белаўскага агіткалектыва, правялі па 5 заняткаў.

Настаўнікі-агітатары сярэдняй школы тав. Завістоўская і тав. Сканеўскі праводзяць з агітатарамі інструкцыйныя нарады.

Падрыхтоўка да выбараў праходзіць ва ўмовах класавай барацьбы. Ёсць выпадкі варожых выступленняў.

Райкомам праведзена праверка выканання соцыялістычных дагавораў, заключаных у чэсць дастойнай сустрэчы дня выбараў і гадавіны Вялікай Кастрычніцкай рэволюцыі. Нечкаўскі і Бемаўскі сельсоветы поўнасцю закончылі хлеба-і бульбапастаўкі дзяржаве. Рабочыя гумава-цясёмачнай фабрыкі тт. Віленская, Рождзінскі, Арцішэўскі і іншыя выконваюць нормы на 150—200 процантаў.

Многія партарганізацыі добра разгарнулі агітацыйна-масавую работу, але ёсць і такія партарганізацыі, якія яшчэ не ўключыліся як след у выбарчую кампанію (фінбанк, упаўнаркамзаг).

Мы намячаем правесці куставыя семінары агітатараў і кіраўнікоў агіткалектываў. З лістапада намецілі правесці нараду селькораў і рабкораў насценных газет.

Загадчык аддзела прапаганды і агітацыі Кольнаўскага райкома партыі тав. Самойленка расказаў аб рабоце, якую яны правялі ў сувязі з падрыхтоўкай да выбараў.


У Кольнаўскім раёне налічваецца 340 агітатараў, з іх 93 чалавекі праводзяць работу на яўрэйскай і польскай мовах. У двух кустах праведзены семінары агітатараў. Агітатары праслухалі лекцыі і даклады аб Канстытуцыі СССР і БССР, аб выбарчым законе, аб правах і абавязках грамадзян Саюза ССР.

У спрэчках выступілі загадчыкі аддзелаў Гродненскага гаркома партыі тав. Левіна, Гродненскага райкома тав. Рыбнікаў, Саколкаўскага—тав. Несцярэнка, Крынкаўскага — тав. Мядзведзеў і іншыя. Усяго выступіла 10 чалавек.

Старшыня абласнога камітэта МОПР'а тав. Каплан гаварыла аб задачах мопраўскіх арганізацый у выбарах і прадстаячых выбарах у мопраўскіх арганізацыях, аб тым, што трэба ўзмацніць правядзенне інтэрнацыянальнай работы па ўчастках сярод выбаршчыкаў.

Сакратар абкома партыі тав. Сямёнаў спыніўся ў сваім выступленні на тых задачах, якія стаяць перад партыйнымі арганізацыямі на бліжэйшы перыяд.

Р. Кісельман.



У гарадскім парткабінеце Нарыльска (Таймырская нацыянальная акруга). Злева направа: комсамольцы В. К. Сарокін, А. А. Дзісон, В П. Хромава і комуніст Н. Д. Палякоў.
Фота С. Малабіцкага. Фота ТАСС.

З чым работнікі мастацтваў сустракаюць гадавіну Кастрычніка

II. У мастакоў

У дні святкавання XXIII гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі ў Мінску адкрыецца выстаўка «Ленін і Сталін—арганізатары беларускай дзяржаўнасці». На гэтай выстаўцы значнае месца зоймуць работы мастакоў Беластока.

У пятым аддзеле выстаўкі, прысвечаным вызваленню Заходняй Беларусі з-пад прыгнёту польскіх памешчыкаў і капіталістаў, будзе выстаўлена скульптурная група «Вызваленая Заходняя Беларусь» таленавітага беластоцкага скульптара Н. Я. Рапапорта. Скульптура адлюстроўвае тarжаство вызваленага народа, яго любоў і ўдзячнасць да сваёй вызваліцельніцы Чырвонай Арміі.

Другі беластоцкі скульптар С. Л. Мессер прадставіў на выстаўку бюст таварыша Сталіна, над якім ён натхнёна працаваў на працягу 5 месяцаў. Высокую ацэнку ў час адбору работ на выстаўку атрымалі работы таленавітых беластоцкіх графікаў Кшычаноўскага і Ляндау, мастакоў Краеўскага, Малярэвіч, братоў Зайдэнбойтэль, А. М. Бермана, Мандэльцвайга і іншых. Удзел у выстаўцы «Ленін і Сталін — арганізатары беларускай дзяржаўнасці» з'явіцца завяршэннем творчага года нашых мастакоў у новых умовах.

Назаўсёды канулі ў нябыт змрочныя часы беспрацоўя і творчага заняпаду, калі мастакі вымушаны былі, каб не памерці з голаду, ісці ў «богамазы», пісаць карціны па заказу шалеючых ад ажырэння паноў, прадаваць свае творы за мізэрныя грашы. У нас няма беспрацоўных мастакоў. Нашы мастакі плённа працуюць на карысць народа, на карысць сваёй радзімы. Творчая праца мастакоў дастойна ацэньваецца ў нашай краіне.

Характэрна прывесці такі прыклад. У 1938 годзе ў Беластоку была наладжана выстаўка карцін. Яе наведала... 30 чалавек. Дзве карціны з выстаўкі былі прададзены. Выстаўку работ маскоўскіх і ленінградскіх мастакоў, наладжаную ў Беластоку летам 1940 года, наведала больш 10 тысяч чалавек. Гэты прыклад ярка паказвае, наколькі адарваным было мастацтва ад народа ў былой панскай Польшчы і наколькі масавым, цесна звязаным з народам з'яўляецца яно ў краіне соцыялізма.

Новыя гарызонты адкрыліся перад мастакамі Беластока. Змяніліся адносіны да рэчаіснасці, расшырылася тэматыка. Мастакі Беластока натхнёна працавалі над работамі да выстаўкі «Ленін і Сталін — арганізатары беларускай дзяржаўнасці». Зараз мастакі ўключыліся ў падрыхтоўку да выстаўкі работ беластоцкіх мастакоў у Маскве, якая адкрыецца ў 1941 годзе, і да выстаўкі «Наша радзіма», якая адбудзецца ў 1942 годзе.

Скульптар С. Л. Мессер прыступіў да работы над вялікай фігурай Сталіна на трыбуне. Гэта скульптура па замыслу аўтара пакажа згуртаванасць народа вакол правадыра. Ужо гатоў эскіз гэтай скульптуры.

Над вялікай графічнай работай «Новы Беласток» працуе таленавіты мастак Кшычаноўскі. Мастак А. М. Берман прыступае да работы над вялікім палатном «Балет у Вялікім тэатры БССР». Ён-жа працуе таксама над карцінай «Першамайская дэманстрацыя ў Беластоку». Над новымі кампазіцыямі з калгаснага жыцця працуюць браты Зайдэнбойтэль.

Выдатны знаўца беларускага народнага выяўленчага мастацтва тав. Манцэвіч заканчвае цікавую работу—шматматыўны народны кавёр, у цэнтры якога будзе партрэт таварыша Сталіна, а вакол разнастайныя кампазіцыі: сустрэча Чырвонай Арміі 17 верасня 1939 года, ілюстрацыі да асноўных артыкулаў Сталінскай Канстытуцыі і т. д.

У сувязі з набліжэннем гадавіны Вялікага Кастрычніка брыгады мастакоў працуюць над мастацкім афармленнем Беластока да свята.

Оргкамітэт саюза совецкіх мастакоў БССР распачаў прыём беластоцкіх мастакоў у члены і кандыдаты Саюза. Прыняты ўжо 12 чалавек, у тым ліку ў члены Саюза совецкіх мастакоў прыняты тт. Кшычаноўскі, Ляндау, Краеўскі, Малярэвіч, браты Зайдэнбойтэль.

Т. Лясовіч.

АКТЫВІСТКІ

Прайшло нямнога больш года з тых пор, як Чырвоная Армія вызваліла народы заходніх абласцей Беларусі з-пад цяжкага ярма польскіх памешчыкаў і капіталістаў. За гэты невялікі час у жыцці працоўных адбыліся найвялікшыя перамены. Выпраміла спіну і вызваленая жанчына. У корані змянілася яе становішча. Жанчына сёння нароўні з мужчынам актыўна ўдзельнічае ва ўсіх галінах гаспадарчага, дзяржаўнага, грамадска-палітычнага жыцця.

Жонкі чыгуначнікаў Беластоцкай чыгункі—гэта баявыя памочнікі партыйных арганізацый у іх барацьбе за паспяховае правядзенне ў жыццё дырэктыў партыі і ўрада.

Сярод чатырох чыгуначнікаў, выбраных дэпутатамі Вярхоўнага Совета БССР—дзяўчына тав. Юхневіч. Зусім нядаўна яна была прыбіральшчыцай на станцыі Крулеўшчына. Цяпер тав. Юхневіч—старшыня бытавой камісіі дарожнага камітэта профсаюзаў.

У кастрычніку 1939 года на Беластоцкай чыгунцы працавала ўсяго толькі 171 жанчына. Зараз іх налічваецца звыш 2 тысяч. З іх—тры начальнікі станцый, 9 дзяжурных па станцыі, 8 качагараў 1 сцэпшчыца, 11 стрэлачніц, 327 праваднікоў і т. д.

За 1940 год на цэнтральных курсах Народнага Камісарыята шляхоў зносін абучалася 47 жанчын—начальнікаў станцый, планавікоў і эканамістаў. 259 патрыётак транспарта закончылі дарожныя і аддзялённыя курсы. Зараз каля 350 жанчын абучаюцца на розных курсах, паспяхова авалодваючы складанымі чыгуначнымі прафесіямі.

На Беластоцкай чыгунцы зараз шырыцца рух жанчын-актывістак. Усюды адчуваецца іх гаспадарскае вока, іх клапатлівая рука. Дзе-б ні пабывалі грамадчыцы, усюды яны наводзяць узорны парадак, чыстату і ўтульнасць. Вялікую дапамогу хатнія гаспадыні аказалі ў навядзенні парадку ў пасажырскіх паяздах. Жонкі чыгуначнікаў абсталявалі 8 узорных паяздоў: пашылі больш 3 тысяч фіранак, вышылі 400 абрусоў на столікі, дапамаглі забяспечыць вагоны графінамі.

Усё гэта зроблена па ініцыятыве старшынь советаў, жонак чыгуначнікаў тт. Навашынай (станцыя Беласток), Квяткоўскай (станцыя Лапы), Спічэнка (станцыя Гродна) — і пры ўдзеле актывістак Раманавай, Кавалеўскай, Барпевіч, Башэк, Цвірко, Салеўскай, Шапіра, Бродзік, Страледкай і іншых.

Зрабіўшы пешы 300-кіламетравы паход, дамашнія гаспадыні-чыгуначніцы Беластоцкага і Маладзечынскага аддзяленняў пазнаёміліся з бытавымі ўмовамі чыгуначнікаў, дапамаглі пуцявым рабочым арганізаваць рамонт будак і прывялі іх у парадак. Найбольш пісьменныя і падрыхтаваныя актывісткі правялі звыш 60 гутарак аб соцыялістычным спаборніцтве і стаханаўска-крываносаўскім руху на транспарце, аб Сталінскай Канстытуцыі і Указе Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня.

164 стрэлкі прыведзены ва ўзорнае і культурнае становішча сіламі жанчын.

Пасля перадачы раду школ чыгуначнаму транспарту, грамадчыцы арганізавалі некалькі суботнікаў па ўборцы школьных памяшканняў і двароў пасля рамонту, дапамаглі наладзіць работу бацькоўскіх камітэтаў, арганізавалі школьныя буфеты і т. д.

Хатнія гаспадыні прымаюць актыўны ўдзел і ў гуртках мастацкай самадзейнасці. Больш 700 актывістак з'яўляюцца членамі струнных, драматычных, харавых гурткоў. 172 жанчыны былі дапушчаны да ўдзелу ў дарожным аглядзе мастацкай самадзейнасці.

Каштоўную ініцыятыву праявілі нядаўна грамадчыцы паравознага дэпо Гродна тт. Улейчык, Радзевіч, Тарасава і іншыя. Яны арганізавалі дастаўку гарачых абедаў для паравознікаў і рамонтнікаў дэпо непасрэдна на вытворчасць. Калектыў гродненскіх паравознікаў адобрыў ініцыятыву актывістак.

І зараз, у час выбарчай кампаніі ў мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных, жонкі чыгуначнікаў, актывісткі актыўна ўзяліся за работу. Яны раз'ясняюць выбаршчыкам Палажэнне аб выбарах, правяраюць спіскі выбаршчыкаў, чэсна выконваюць любое даручэнне партыйных арганізацый.

Такія будні актывістак-грамадчыц Беластоцкай чыгункі.

А. Кандрац'еў.

Найвялікшая рэволюцыя ў свеце

Дваццаць тры годы назад, 7 лістапада (25 кастрычніка) 1917 года, рускі рабочы клас і бяднейшае сялянства, кіруемыя партыяй большэвікоў, зрабілі пролетарскую соцыялістычную рэволюцыю. У чым адрозненне гэтай рэволюцыі ад усіх іншых рэволюцый?

«Гісторыя народаў, — гаворыць таварыш Сталін,—ведае нямала рэволюцый. Яны адрозніваюцца ад Кастрычніцкай рэволюцыі тым, што ўсе яны былі аднабаковымі рэволюцыямі. Змянялася адна форма эксплаатацыі працоўных другой формай эксплаатацыі, але сама эксплаатацыя аставалася. Змяняліся адны эксплаататары і прыгнятальнікі другімі эксплаататарамі і прыгнятальнікамі, але самі эксплаататары і прыгнятальнікі аставаліся. Толькі Кастрычніцкая рэволюцыя паставіла сабе мэтай — знішчыць **усякую** эксплаатацыю і ліквідаваць **усіх і ўсякіх** эксплаататараў і прыгнятальнікаў».

Кастрычніцкая рэволюцыя справядліва названа народамі ўсяго свету **Вялікай** соцыялістычнай рэволюцыяй.

Па сваіх выніках і значэнню, па свайму размаху Кастрычніцкая соцыялістычная рэволюцыя у СССР ёсць самая найвялікшая з усіх рэволюцый. Яна ўпершыню ў гісторыі чалавецтва знішчыла ўсякую эксплаатацыю чалавека чалавекам, усякі гнёт: эканамічны, палітычны і нацыянальны. Яна паставіла ва ўладзе рабочы клас, зламала буржуазную дзяржаўную машыну і стварыла новую дзяржаву—дзяржаву дыктатуры рабочага класа.

Вялікая пролетарская рэволюцыя знішчыла прыватную ўласнасць на фабрыкі і заводы, банкі і сродкі зносін, на воды і лясы, на зямлю і яе нетры. Усё гэта стала ўсенародным здабыткам — грамадскай соцыялістычнай уласнасцю. З прыгнечанага і эксплаатуемага рабочы клас стаў свабодным і пануючым класам у СССР, працуючым без гаспадароў, без капіталістаў, накіроўваючым усё грамадства да комунізма. Кастрычніцкая рэволюцыя дапамагла працоўнаму сялянству скінуць з сваіх плеч ярмо памешчыкаў, капіталістаў, кулакоў, купцоў і спекулянтаў; яна зрабіла магчымым пераход сялян на новы, калгасны шлях — шлях шчаслівага, заможнага жыцця ў калектыўных гаспадарках.

Такім чынам Кастрычніцкая рэволюцыя ў **корані** змяніла ўвесь лад і парадак жыцця на совецкай зямлі, ачысціўшы яе ад усялякіх эксплаататараў і прыгнятальнікаў.

Вялікая Кастрычніцкая соцыялістычная рэволюцыя мае вялікае міжнароднае значэнне, так як яна нанесла сакрушальны ўдар па сусветнаму панаванню капітала, расколоўшы свет на дзве часткі: свет соцыялізма і свет капіталізма. Цяпер чалавецтва ведае дзве сістэмы: капіталістычную, адміраючую, загніваючую, здыхаючую ў пакутах крызісаў і крывавых войнаў, і соцыялістычную, дзе шчасліва і дружна жывуць народы, прыцягваючы да сябе любоў працоўных усіх краін.

Многа паўстанняў і рэволюцый бачыў стары свет, але падобных Кастрычніцкай рэволюцыі гісторыя пакуль яшчэ не ведала.

Звыш 2-х тысяч год назад адбылося вялікае паўстанне рымскіх гладыятараў пад узначальваннем Спартака. Хаця паўстаўшыя захапілі ўсю Паўднёвую Італію, але ў канцы канцоў былі разбіты рабаўладальнікамі.

Калі рухнуў рабаўладальніцкі лад, паявіліся новыя эксплаататары і эксплаатуемыя: памешчыкі-феадалы, з аднаго боку, і прыгонныя сяляне, з другога.

Сялянства не раз падымалася на вайну супроць феадалаў. Буйныя сялянскія паўстанні патрасалі Еўропу, у тым ліку і Расію. Усе яны заканчваліся паражэннем прыгнечаных мас. Так, у Італіі пад кіраўніцтвам Дальчыно сялянскае паўстанне працягвалася чатыры годы (1303—1307 гг). Паўстаўшыя былі пераможаны, а іх кіраўнік спален на кастры. Карл Гільом —правадыр «Жакерыі», сялянскага паўстання ва Францыі, быў «каранаван» раскаленым трыножнікам, а затым абезгалоўлен (у 1358 годзе). Паўстанне рускіх сялян пад узначальваннем Івана Балотнікава (1606 — 1607 гг.) скончылася няўдачай. Сцяпан Разін правёў казакаў і сялян з Дона да Сімбірска (1669—1671 годы), але паўстанне было падаўлена, Разіна чацвертавалі ў Маскве. Пакаран быў і Емельян Пугачоў, падняўшы паўстанне сялян у Паваложы і на Урале (1773—1775 годы).

Сто пяцьдзесят з лішнім год назад французская буржуазная рэволюцыя знішчыла феадальныя парадкі і ўстанавіла капіталістычныя, змянілася форма эксплаатацыі, але эксплаататары асталіся.

Першай гераічнай, але ўсё-ж беспаспяховай спробай рабочага класа знішчыць капіталістычную эксплаатацыю была Парыжская комуна (1871 год). За 72 дні свайго існавання яна сумела правесці рад мерапрыемстваў, накіраваных на паляпшэнне жыцця рабочых. Але Комуна не паспела паказаць народным масам матэрыяльных вынікаў рэволюцыі. Гэта было зроблена толькі Вялікай соцыялістычнай рэволюцыяй у СССР, непадзельнае кіраўніцтва якой належыла партыі Леніна — Сталіна.

Іменна тая акалічнасць, што на чале Кастрычніцкай рэволюцыі стаяла выпрабаваная і загартаваная ў баях большэвіцкая партыя, і забяспечыла перамогу рабочага класа. Пролетарыят знішчыў капіталістычны гнёт і ўстанавіў совецкую ўладу як дзяржаўную форму дыктатуры рабочага класа.

Пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі Совецкі Саюз стаў магутнай і непрыступнай крэпасцю соцыялізма.

Ф. Вілін.

ПАДРЫХТОЎКА ДА ВЫБАРАЎ У МЯСЦОВЫЯ СОВЕТЫ ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

Актыўнасць комсамольцаў і моладзі Монькаўскага раёна

Комсамольская арганізацыя Монькаўскага раёна актыўна ўключылася ў выбарчую кампанію.

На прайшоўшым раённым комсамольскім сходзе, прысвечаным вынікам XIV з'езда комсамола Беларусі, комсамольцы расказалі аб іх удзеле ў падрыхтоўцы да выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных, намецілі канкрэтныя мерапрыемствы па правядзенню масава-палітычнай работы на выбарчых участках.

Пярвічныя арганізацыі лепшых комсамольцаў рэкамендавалі агітатарамі, прапагандыстамі, чытчыкамі, бяседчыкамі, членамі выбарчых камісій. Райком комсамола зацвердзіў 43 члены ЛКСМБ агітатарамі і прапагандыстамі. Усе яны прыступілі да работы. Апрача таго, 234 маладых выбаршчыкі прыцягнута да работы на ўчастках. Яны праводзяць чыткі газет, журналаў, кніг. Большасць з іх упершыню ўдзельнічае ў грамадскай рабоце.

У пярвічнай комсамольскай арганізацыі мястэчка Трэсцяны ўсе 12 комсамольцаў уключыліся ў выбарчую кампанію. Большасць з іх працуе агітатарамі, некаторыя з'яўляюцца членамі выбарчых камісій. Член комсамола тав. Козел прыступіла да работы у гуртках па вывучэнню Канстытуцыі СССР, Палажэння аб выбарах у мясцовыя Советы. Яна расказвае аб бягучых падзеях, чытае найбольш цікавыя артыкулы і заметкі з газет. Выбаршчыкі мястэчка з радасцю ідуць на заняткі. Надрэнна таксама працуюць комсамольцы—агітатары тт. Камароўская, Тэкель, Махамет, Бекер і іншыя.

З ліку лепшых комсамольцаў у састаў выбарчых камісій па раёну вылучана звыш 100 чалавек.

У сувязі з выбарамі ў пярвічныя арганізацыі штодзённа паступаюць заявы ад перадавой моладзі аб прыняцці іх у рады ВЛКСМ. На апошнім пасяджэнні райкома комсамола прынята ў комсамол 5 чалавек. Сярод прынятых—тав. Ракоўскі. Да прыходу Чырвонай Арміі ён тры гады быў батраком. У апошні час працаваў стрэлачнікам на станцыі Кнышын, зараз актыўна ўдзельнічае ва ўсіх мерапрыемствах, праводзімых партыяй і ўрадам.

Раённая комсамольская арганізацыя намеціла ў бліжэйшыя дні правесці на ўсіх выбарчых участках сходы маладых выбаршчыкаў, выпусціць насценныя газеты і арганізаваць агітацыйны рэйд комсамола.

П. Грышкін,
сакратар Монькаўскага райкома ЛКСМБ.



Тав. Рэгіна Каплан абласной арганізацыяй МОПР'а вылучана ў абласную выбарчую камісію. Фота А. Сапіра.

АБСТАЛЯВАННЕ ВЫБАРЧЫХ УЧАСТКАЎ

ЛОМЖА. **(Ад нашага карэспандэнта).** У Ломжынскім раёне ў перыяд падрыхтоўкі да выбараў вялікая ўвага ўдзяляецца арганізацыйна-тэхнічным пытанням. Для ўсіх арганізаваных у горадзе 13 выбарчых участкаў падабраны памяшканні. Участковыя выбарчыя камісіі самі непасрэдна прымаюць актыўны ўдзел у абсталяванні памяшканняў. Цяпер яны актыўна ўзяліся за іх афармленне. Падрыхтоўваецца матэрыял для абсталявання кабін. Будынкі ўпрыгожваюцца лозунгамі, плакатамі, партрэтамі правадыроў партыі і ўрада.

Усе памяшканні выбарчых участкаў ужо электрыфіцыраваны. На ўсякі выпадак, кожны ўчастак забяспечваецца трыма карасінавымі лямпамі. 7 выбарчых участкаў тэлефанізіраваны. Днямі будуць пастаўлены тэлефоны яшчэ ў двух выбарчых участках.

Цэлы рад камісій ужо заканчваюць абсталяванне і афармленне памяшканняў выбарчых участкаў. Асабліва выдзяляецца выбарчы ўчастак № 2 16-й выбарчай акругі, дзе старшынёй участковай камісіі з'яўляецца Зінаіда Іванаўна Ваўчкова, выбарчы ўчастак № 4 15-й выбарчай акругі (старшыня камісіі Грыгорый Васільевіч Латушкін) і выбарчы ўчастак № 2 17-й выбарчай акругі (старшыня камісіі Аляксандр Сцяпанавіч Ваўчок). З 2-га лістапада на кожным выбарчым участку ўстанаўліваюцца дзяжурствы членаў участковых выбарчых камісій.

Для складання спіскаў выбаршчыкаў прыцягнута 35 вучняў старшых класаў. Пасля заняткаў яны з вялікім жаданнем і ахвотай выконваюць ускладзеныя на іх пачотныя абавязкі. Былі складзены адразу спіскі па вуліцах. Пасля гэтага 17 чалавек працавалі над складаннем папярэдніх спіскаў на выбарчых участках. Гэтая работа ўжо закончана. 2-га лістапада папярэднія спіскі ўручаны ўчастковым выбарчым камісіям, якія з дапамогай акруговых камісій удакладняюць іх.

9.640 выбаршчыкаў займаецца ў гуртках

БЕЛЬСК. Працоўныя раёна актыўна рыхтуюцца да выбараў дэпутатаў у мясцовыя Советы. Закончана арганізацыя выбарчых участкаў, створаны ўчастковыя камісіі. Раён разбіт на 31 выбарчы ўчастак. У памяшканнях, дзе змяшчаюцца ўчастковыя камісіі, устаноўлены дзяжурствы членаў камісій.

600 чалавек агітатараў праводзяць агітацыйна-масавую работу сярод выбаршчыкаў. У вёсках агітатары замацаваны за дзесяцідварамі. Арганізавана 540 гурткоў выбаршчыкаў, у якіх займаецца 9.640 чалавек. У гуртках вывучаюць Сталінскую Канстытуцыю і Палажэнне аб выбарах.

Ва ўсіх сельсоветах закончана папярэдняе складанне спіскаў выбаршчыкаў.

Закончаны арганізацыйныя работы

ПАРЭЧЧА. Тут закончаны работы па ўтварэнню выбарчых акруг, участкаў і стварэнню камісій. Шырока разгарнулася агітацыйна-масавая работа сярод выбаршчыкаў. Агітатарамі працуе 343 чалавекі, якімі ахоплена каля 10 тысяч выбаршчыкаў. Арганізавана 83 гурткі па вывучэнню Канстытуцыі і Палажэння аб выбарах.

Заканчваецца мастацкае афармленне памяшканняў участковых выбарчых камісій. Развешваюцца лозунгі і плакаты. Да XXIII гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі будзе закончана афармленне ўсіх выбарчых участкаў.

З дакументаў мінулага

22 жніўня 1920 г. польскія войскі ў баях з адступаючымі ар'ергарднымі часцямі Чырвонай Арміі ўвайшлі ў Беласток. На працягу 23, 24 і 25 жніўня польскія салдаты грабілі, збівалі і забівалі мірных жыхароў, перш за ўсё яўрэяў. І не толькі іх. Пагром праводзіўся планамерна, з ведама і дазволу камандавання польскай арміі. У камюніке польскага генеральнага штаба ад 24 жніўня гаварылася:

> «Пры заняцці Беластока першай дывізіяй легіёнаў 22 гэтага месяца раніцой у самым горадзе на працягу 20 гадзін ішлі яшчэ гарачыя вулічныя баі з прыбыўшай з Гродна 55-й совецкай дывізіяй і мясцовым яўрэйскім насельніцтвам, якое значна ўзмацніла большэвіцкія рады».

Гэта было, зразумела, недвухсэнсоўным заклікам да расправы з мясцовым насельніцтвам і апраўданнем пагромнай дзейнасці польскіх афіцэраў і жаўнераў.

Расправа над насельніцтвам Беластока была адказам варшаўскага ўрада рэволюцыйным беластоцкім рабочым, якія падтрымлівалі совецкую ўладу і ўсямерна дапамагалі Чырвонай Арміі. Беласток быў буйнейшым рабочым цэнтрам на шляху да Варшавы і ў ім быў створан Часовы польскі рэволюцыйны ўрад з тт. Мархлеўскім і Дзержынскім на чале. Многа польскіх і яўрэйскіх рабочых, асабліва моладзі, уліліся ў часці Чырвонай Арміі.

Эвакуацыя Беластока совецкай уладай праводзілася ў поўным парадку. 20 і 21 жніўня пакінулі горад усе совецкія ўстановы. У вулічных баях 22 жніўня мясцовае насельніцтва ўдзелу не прымала. Камюніке польскага генеральнага штаба было яўнай хлуснёй.

У той-жа дзень—22 жніўня, калі на вуліцах горада яшчэ ішлі баі, у будынку магістрата адбыўся арганізацыйны сход так званага Часовага грамадзянскага камітэта, у састаў якога ўвайшлі прадстаўнікі буйнейшай польскай, яўрэйскай і нямецкай буржуазіі. Першыя дні дзейнасці гэтага камітэта праходзілі ў час пагрому. Пагромная дзейнасць польскіх войск знайшла водгук на пасяджэннях камітэта і ў яго пратаколах, якія ніжэй прыводзім:

ПРАТАКОЛ

пасяджэння Часовага грамадзянскага камітэта ваяводскага горада Беластока

дня 25 жніўня.

Прысутнічаюць: 25 членаў камітэта, згодна прыкладзенага спіска.

Старшынствуе: старшыня доктар З. Семашка.

Сакратарствуе: сакратар Я. Шапіра.

Сход пачаўся ў 9 гадзін раніцы.

1. Справа безапаснасці горада.

Камендант грамадзянскай аховы безапаснасці пан судзя Дэконскі, дакладваючы, з сумам сцвярджае, што ўчарашні дзень прайшоў вельмі дрэнна. Было шмат выпадкаў рабунку, ёсць раненыя і пакалечаныя. Пан камендант звярнуўся па гэтай справе да каменданта горада пана Стылін-Стылінскага, просячы яго забяспечыць парадак у горадзе, але атрымаў ухілены адказ, што гэта не справа грамадзянскага камітэта і што ваенная ўлада нічога для горада зрабіць не можа, бо горад у асобе грамадзянскага камітэта нічога для арміі не робіць. Пан камендант разам з астатнімі членамі секцыі грамадзянскай безапаснасці адхіліў усе абвінавачванні, указаў на тое, што грамадзянскі камітэт робіць усё для арміі, але шмат зрабіць не можа, таму што большэвікі не пакінулі ніякіх запасаў прадуктаў харчавання і грашовых сродкаў і з прычыны здарэнняў, якія адбываюцца ў апошнія дні, работа камітэта не можа нармальна адбывацца. Такое становішча спраў не можа доўга працягвацца. Калі гэта працягнецца далей, пан камендант складзе свае абавязкі і зніме з сябе ўсякую адказнасць за магчымыя вынікі такой бяздзейнасці ваеннай улады, таму што грамадзянская міліцыя бяссільна перад грабячымі жаўнерамі і нічога супроць іх зрабіць не можа.

Як відаць, у той гарачы час члены камітэта гаварылі мовай, якой ніколі пазней не ўжывалі. Пан судзя Дэконскі ясна гаворыць аб рабунках і забойствах, аб грабячых жаўнерах і аб папушчэнні ваеннага каменданта горада Беластока пана Стылін-Стылінскага. Асабліва цікавым з'яўляецца заява гэтага пана, што пагром не датычыцца грамадзянскага камітэта. Іншымі словамі: «Не ваша справа, не суньце свайго носа ў гэта, мы дзейнічаем па ўказанню зверху...»

> ...Пасля выступлення раду прамоўцаў, якія аднадушна выказваліся ў тым сэнсе, што першай задачай камітэта з'яўляецца прадпрыняцце самых энергічных хадайніцтваў перад уладай, каб забяспечыць жыццё і маёмасць насельніцтва, — старшыня доктар Семашка рашуча асуджае бяздзейнасць каменданта горада пана Стылін-Стылінскага і прапануе наступную рэзалюцыю:
>
> «Часовы грамадзянскі камітэт, абмеркаваўшы справу здарэнняў апошніх дзён, прыходзіць да заключэння, што ў нядзелю (гэта значыць 22 жніўня) над становішчам немагчыма было запанаваць, бо Беласток быў тады непасрэднай арэнай ваенных дзеянняў, але падзеі апошніх дзён маюць месца толькі дзякуючы бяздзейнасці ваеннай улады, якая мае абавязак абуздаць злачыннае свавольства салдат. Сцвярджаючы гэта, камітэт рашае пераслаць копію гэтай рэзалюцыі вышэйшаму ваеннаму камандаванню».
>
> Пан Глінскі выказваецца супроць зместу гэтай рэзалюцыі, якая абражае годнасць ваеннай улады. Прамоўца лічыць, што ў многіх выпадках пацярпеўшыя пераўвялічваюць.
>
> Пасля тлумачэння доктара Семашкі, што ён хоча не пакараць вінаватага каменданта, але высветліць праўду і пасля выступленняў раду прамоўцаў, камітэт прымае прапанаваную доктарам Семашка рэзалюцыю без яе апошняй часткі...

Тэкст гэтай рэзалюцыі не быў ніколі надрукаваны. Ён друкуецца намі ўпершыню.

> ...Камітэт заслухоўвае справаздачу памочніка каменданта грамадзянскай аховы пана Бока, паасобных членаў камітэта, а таксама пацярпеўшых у час здарэнняў апошніх дзён, асабліва апошняй ноччу. Пан пастар Цырквіц расказвае, што апошняй ноччу салдаты грабілі ўжо не толькі яўрэяў, але і хрысціян.

Гэта вельмі важнае паказанне. Аказваецца, што жаўнеры грамілі не толькі яўрэйскае насельніцтва, але ўсіх без разбору. Маральнае аблічча белапольскай арміі, якую ўвесь буржуазны друк называў «рыцарамі хрысціянскай культуры супроць усходняга варварства», выступае ва ўсёй сваёй агідзе. А хіба пана пастара Цырквіца можна лічыць непрыстрасным сведкай, заслугоўваючым давер'я.

> ...Камітэт па прапанове доктара Цытрона рашае стварыць камісію ў саставе аднаго з памочнікаў каменданта аховы безапаснасці, доктара Цытрона, пана Вечорэка і пастара Цырквіца і прадстаўніка ваеннай улады, каб зарэгістрыраваць на месцы выпадкі рабункаў і т. д.

Наколькі нам вядома, камісія гэта ніколі не сабралася і нічога не зрабіла. На наступных пасяджэннях камітэт займаўся справай хлуслівага камюніке польскага генштаба.

> ...Паяўляюцца два афіцэры, прадстаўнікі вярхоўнага камандавання польскай арміі, разам з амерыканскім карэспандэнтам містэрам Райтам з просьбай праінфарміраваць іх аб становішчы, у якім знаходзіцца горад, аб цяперашнім упраўленні горада і т. д.
>
> Старшыня пан доктар Семашка дае панам афіцэрам жаданыя інфармацыі...
>
> Пан Шатыя паведамляе камітэту, што камюніке генеральнага штаба ад 24 гэтага месяца гаворыць аб заняцці Беластока пасля 20-гадзінных вулічных баёў, у якіх на баку большэвікоў прыняла ўдзел яўрэйскае насельніцтва. Прамоўца просіць старшыню і членаў камітэта хрысціян, каб яны абвергі ў прысутнасці паноў афіцэраў гэтую звестку.
>
> Пан доктар Семашка ад імені камітэта сцвярджае, што камітэт не ведае ніякіх канкрэтных фактаў аб удзеле яўрэйскага насельніцтва ў вулічных баях.
>
> Пасля ўходу паноў дэлегатаў вярхоўнага камандавання, камітэт падрабязна абмяркоўвае справу вышэй указанага камюніке, пры чым усе прамоўцы сцвярджаюць, што змест камюніке не адпавядае сапраўднасці, таму што яўрэйскае насельніцтва ўдзелу ў вулічных баях не прымала, тэарэтычна-ж можна лічыць магчымым, што паасобныя адзінкі, як яўрэі, так і хрысціяне прымалі ўдзел у баях.

(З пратакола пасяджэння Часовага грамадзянскага камітэта ад 26 жніўня 1920 года).

Але на наступным пасяджэнні, 27 жніўня, члены камітэта спахваціліся, што абвяргаць камюніке генеральнага штаба — не вельмі простая справа. Па прапанове старшыні пана доктара Семашкі была створана спецыяльная камісія, каб сфармуліраваць тэкст папраўкі. Адзін з членаў камісіі ксёндз Хадыка сарваў яе работу пад прадлогам, што ён не можа прымаць удзелу ў камісіі, бо не прысутнічаў у час дыскусіі па гэтаму пытанню. Ксёндз Хадыка ўказаў на тое, што ў горадзе пануе «несімпатычны ў адносінах да яўрэяў настрой», бо насельніцтва лічыць, што ў час совецкай улады «над горадам панавалі яўрэі».

Дыскусія была вельмі ажыўленая. Пан Зелігман, член камітэта, настойваў на прыняцці папраўкі. У канцы канцоў кропку над «і» паставіў пан Германоўскі, які сказаў:

> «У якасці Германоўскага, грамадзяніна горада Беластока, я вымушан прызнацца, што яўрэйскае насельніцтва пакрыўджана. Але з другога боку, у якасці грамадзяніна Рэчы Паспалітай, я вымушан сказаць, што калі-б мы далі папраўку да камюніке, мы абразілі-б годнасць вярхоўнага камандавання. З прычыны вышэй сказанага мною не можа быць аднадушнага рашэння камітэта і таму я прашу пана Зелігмана, каб ён зняў сваю прапанову».

Пану Зелігману не асталося нічога іншага, як сваю прапанову зняць.

—о—

Такім чынам можна лічыць устаноўленым на падставе пратаколаў Часовага грамадзянскага камітэта, што:

На працягу 22, 23, 24 і 25 жніўня 1920 года польскія войскі беспакарана грабілі горад, збівалі і забівалі мірных жыхароў.

Грабілі і збівалі не толькі яўрэяў, але і палякаў і беларусаў.

Гэта было магчымым дзякуючы заахвочваючаму становішчу ваеннага каменданта горада пана Стылін-Стылінскага.

Пан Стылін-Стылінскі дзейнічаў па ўзгадненню з устаноўкай камюніке польскага генеральнага штаба ад 24-га жніўня 1920 года.

М. Навагрудскі.

САСТАЎ АКРУГОВЫХ ВЫБАРЧЫХ КАМІСІЙ ГОРАДА БЕЛАСТОКА

Беластоцкі абласны выканаўчы камітэт пастановай ад 24 кастрычніка зацвердзіў састаў акруговых выбарчых камісій па выбарах у абласны Совет дэпутатаў працоўных, у якія ўвайшлі прадстаўнікі грамадскіх арганізацый і таварыстваў працоўных горада Беластока.

Па Ленінскай выбарчай акрузе № 1 старшынёй акруговай выбарчай камісіі зацверджана тав. **Петрак** Галіна Іосіфаўна—ад гарадской арганізацыі МОПР'а, намеснік старшыні—**Талкачоў** Нікалай Трафімавіч—ад комуністычнай арганізацыі горада Беластока, сакратар—**Белкін** Майсей Пейсахавіч—ад комсамольскай арганізацыі гор. Беластока, члены: **Абрамовіч** Іосіф Натавіч—ад рабочых і служачых 2-га тэкстыльнага камбіната, **Сінін** Нікалай Ільіч—ад ваеннаслужачых, **Чэрленчакевіч** Ніна Іосіфаўна—ад профарганізацыі работнікаў пачатковых і сярэдніх школ, **Клейн** Владзіслаў Станіслававіч—ад рабочых і служачых 6-га тэкстыльнага камбіната, **Кукса** Ніна Абрамаўна—ад арганізацыі Асоавіяхіма гор. Беластока, **Завістоўская** Марыя Мартынаўна—ад рабочых і служачых 13-га тэкстыльнага камбіната.

Па Чырвонаармейскай выбарчай акрузе № 2: старшыня—**Гарошкін** Пётр Арцёмавіч—ад комуністычнай арганізацыі гор. Беластока, намеснік старшыні—**Маліноўскі** Франц Вікенцевіч—ад профарганізацыі работнікаў жыллёва-комунальнай гаспадаркі гор. Беластока, сакратар **Петранюк** Елена Васільеўна—ад профарганізацыі шарсцянікаў гор. Беластока, члены: **Пашко** Еўгенія Нікішчна—ад рабочых і служачых 25-ай тэкстыльнай фабрыкі, **Тараканаў** Александр Іванавіч—ад комсамольскай арганізацыі гор. Беластока, **Лапіцкі** Александр Іванавіч—ад ваеннаслужачых, **Шэпляцкі** Нахман Механавіч—ад Беластоцкай арганізацыі МОПР'а, **Глінер** Меер Беркавіч—ад рабочых і служачых 17-й тэкстыльнай фабрыкі, **Пухноўская** Анна Іосіфаўна—ад профарганізацыі работнікаў пачатковых і сярэдніх школ.

Па Фабрычнай выбарчай акрузе № 3: старшыня—**Якаўлеў** Дзімітрый Васільевіч—ад комуністычнай арганізацыі гор. Беластока, намеснік старшыні—**Камельман** Хаза Янкелеўна—ад рабочых і служачых 29-ай тэкстыльнай фабрыкі, сакратар—**Гурскі** Владзіслаў Александравіч—ад профарганізацыі шарсцянікаў, члены: **Зелянкевіч** Соф'я Вікенцеўна—ад рабочых і служачых 3-га тэкстыльнага камбіната, **Левінтаў** Грыгорый Грыгор'евіч—ад рабочых і служачых мэблевай фабрыкі горпромкамбіната, **Сямёнаў** Міхаіл Георгіевіч—ад ваеннаслужачых, **Лясноўскі** Васілій Александравіч—ад рабочых і служачых Беластоцкага леспромтрэста, **Рэк** Марыя Матвееўна—ад рабочых і служачых 2-га тэкстыльнага камбіната, **Хват** Беніямін Давідавіч—ад гарадской арганізацыі МОПР'а.

Па Совецкай выбарчай акрузе № 4: Старшыня—**Члубнікаў** Іван Сцяпанавіч—ад комуністычнай арганізацыі гор. Беластока, намеснік старшыні — **Пісарэвіч** Владзіслаў Людвігавіч—ад рабочых і служачых 3-га тэкстыльнага камбіната, сакратар—**Навагрудскі** Майсей Маркавіч—ад гарадской арганізацыі МОПР'а, члены: **Берыла** Іван Міхайлавіч—ад рабочых і служачых 2-га тэкстыльнага камбіната, **Іваноўская** Анна Нікалаеўна—ад профарганізацыі работнікаў сувязі, **Палішчук** Афанасій Лукіч—ад ваеннаслужачых, **Эпштэйн** Соф'я Абрамаўна — ад комсамольскай арганізацыі гор. Беластока, **Валянскі** Франц Антонавіч — ад гарадской арганізацыі Асоавіяхіма, **Літвіна** Ірына Вітольдаўна — ад рабочых і служачых табачнай фабрыкі.

Па Цэнтральнай выбарчай акрузе № 5: старшыня—**Мяжэвіч** Ілья Якаўлевіч—ад комуністычнай арганізацыі гор. Беластока, намеснік старшыні — **Сіжыніцкі** Станіслаў Сцяпанавіч—ад гарадской арганізацыі МОПР'а, сакратар — **Зіслін** Шлёма Іосіфавіч—ад комсамольскай арганізацыі гор. Беластока, члены: **Баршчэўская** Фейга Генафееўна—ад рабочых і служачых 1-га тэкстыльнага камбіната, **Папова** Валенціна Іванаўна — ад профарганізацыі работнікаў медсанпрацы, **Раманоўскі** Барыс Нікалаевіч—ад ваеннаслужачых, **Фурман** Малка Янкелеўна—ад рабочых і служачых 2-га тэкстыльнага камбіната, **Марозава** Соф'я Назараўна — ад таварыства Чырвонага Крыжа **Дземян** Зіта Рудольфаўна—ад рабочых і служачых 6-га тэкстыльнага камбіната.

Па Слабодскай выбарчай акрузе № 6: старшыня—**Шалікаў** Міхаіл Андрэевіч—ад комуністычнай арганізацыі гор. Беластока, намеснік старшыні—**Тыкоцкі** Герш Абрамавіч—ад комсамольскай арганізацыі гор. Беластока, сакратар—**Орлік** Елена Майсееўна—ад арганізацыі Асоавіяхіма, члены: **Венгер** Эйбус Абрамавіч—ад рабочых і служачых 6-га тэкстыльнага камбіната, **Гедзіч** Марыя Андрэеўна — ад профарганізацыі работнікаў дзяржгандлю, **Спірын** Іван Нікалаевіч — ад ваеннаслужачых **Сабалеўская** Канстанцына Канстанцінаўна—ад рабочых і служачых 3-га тэкстыльнага камбіната, **Бачалоўская** Яніна Владзіславаўна ад профарганізацыі работнікаў пачатковых і сярэдніх школ, **Несцярэвіч** Наталья Адамаўна — ад рабочых і служачых 18-й тэкстыльнай фабрыкі.

Па Чыгуначнай выбарчай акрузе № 7: старшыня— **Левартоўскі** Арон Майсеевіч—ад гарадской арганізацыі МОПР'а, намеснік старшыні—**Шыйко** Соф'я Іосіфаўна—ад комуністычнай арганізацыі гор. Беластока, сакратар — **Філіповіч** Владзімір Аляксандравіч—ад таварыства Чырвонага Крыжа, члены: **Радзішэўскі** Сяргей Іосіфавіч — ад комсамольскай арганізацыі гор. Беластока, **Юдэлевіч** Іосіф Шлёмавіч — ад рабочых і служачых 2-га тэкстыльнага камбіната, **Левін** Міхаіл Грыгор'евіч—ад ваеннаслужачых, **Цімафеева** Надзежда Грыгор'еўна — ад рабочых і служачых 6-га тэкстыльнага камбіната, **Бурас** Стэфанія Юльянаўна — ад профарганізацыі работнікаў пачатковых і сярэдніх школ, **Астасевіч** Сцяпан Васільевіч — ад рабочых і служачых Беластоцкага дэпо.

Па Першамайскай выбарчай акрузе № 8: старшыня—**Гарбунова** Марыя Іванаўна—ад комуністычнай арганізацыі гор. Беластока, намеснік старшыні—**Касьяновіч** Павел Іванавіч—ад рабочых і служачых Беластоцкага дэпо, сакратар—**Кліўко** Нікалай Іванавіч—ад рабочых і служачых гарадской комунальнай гаспадаркі, члены: **Новік** Міхаіл Грыгор'евіч—ад комсамольскай арганізацыі гор. Беластока, **Мушынскі** Іосіф Іванавіч—ад рабочых і служачых 2-га тэкстыльнага камбіната, **Алэксееў** Александр Іванавіч—ад ваеннаслужачых, **Капусціна** Груна Абрамаўна—ад профарганізацыі работнікаў пачатковых і сярэдніх школ, **Тэненбаум** Андзік Вольфавіч — ад фізкультурнага таварыства «Харчавік», **Барнецкая** Сабіна Станіславаўна — ад гарадской арганізацыі МОПР'а.

Агенцтва Рэйтэр аб ваенных дзеяннях у Грэцыі

ЛОНДАН, 2 лістапада. (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр паведамляе, што грэчаская пяхота заняла важную гару на грэка-албанскай границы. Захоплен раён, які налічвае некалькі вёсак.

Як зараз высвятлілася, грэчаская авіяцыя бамбардыравала ўчора аэрадром паблізу Карыцы (Корча). Прасунуўшыся ў напрамку Карыцы, грэкі разбурылі некалькі будынкаў.

Учора раніцой італьянская авіяцыя двума паслядоўнымі хвалямі бамбардыравала порт і горад Салонікі. Скінута каля 20 бомб сярэдняга размеру. Разбурана некалькі дамоў, размешчаных на ўзбярэжжы і ў цэнтры горада. У Корфу знішчана некалькі дробных суднаў. Узнікшыя ў горадзе пажары былі хутка ліквідаваны. У рэзультаце бамбардыроўкі 59 чалавек забіта, 84 ранена. Адна бомба ўпала каля школы, дзе былі інтэрніраваны 450 італьянцаў.

Увечары два іншых злучэнні італьянскіх бамбардыроўшчыкаў зноў спрабавалі бамбардыраваць Салонікі, але былі адагнаны. Большасць бомб упала ў мора.

—о—

Ваенныя дзеянні у Грэцыі

НЬЮ-ЙОРК, 2 лістапада. (ТАСС). Як перадае афінскі карэспандэнт агенцтва Юнайтэд Прэс, у камюніке грэчаскага камандавання гаворыцца, што грэчаскія горныя войскі на фронце Флорына пранікл на 3 мілі ўглыб тэрыторыі Албаніі і захапілі рад умацаваных італьянскіх пазіцый. Грэкі захапілі ў палон 10 афіцэраў і 153 салдаты, а таксама вялікую колькасць коней і мулаў. Міністэрства дзяржаўнай безапаснасці, піша далей карэспандэнт, паведамляе, што 1 лістапада ў рэзультаце італьянскіх бамбардыровак забіта 92 і ранена 209 чалавек.

—о—

Італьянская зводка

РЫМ, 2 лістапада. (ТАСС). Італьянскае камандаванне паведамляе: «У Грэцыі нашы войскі прасоўваюцца ў даліне ракі Каламас у напрамку на Яніна і да гор Пінд. Учора наша авіяцыя бамбардыравала ваенны арсенал Саломін і знаходзіўшыяся ў гэтым порце судны, а таксама ваенныя аб'екты на востраве Кофру. Адбыліся моцныя ўзрывы і ўзніклі пажары. Акрамя таго былі зроблены паспяховыя налёты на ваенны лагер ля Скіцера, вакзал Ларысы, дзе быў пашкоджан чыгуначны састаў, Карынфскі канал і на чыгунку Карынф-Афіны, рух на якой быў перарваны ў некалькіх месцах.

Італьянскія самалёты зрабілі паспяховы налёт на Салонікі. У баі з непрыяцельскімі знішчальнікамі, відавочна, быў збіт 1 самалёт праціўніка. Усе нашы самалёты звярнуліся.

У Эгейскім моры нашы паветраныя злучэнні паспяхова бамбардыравалі і падвергі кулямётнаму абстрэлу войскі, якія высаджваліся на востраў Крыт. Былі пашкоджаны параходы, партовыя збудаванні і ваенныя матэрыялы. Усе нашы самалёты звярнуліся.

ГЕРМАНСКІЯ ПАВЕДАМЛЕННІ

БЕРЛІН, 2 лістапада. (ТАСС). Вярхоўнае камандаванне паведамляе, што ўчора разрозненыя германскія бамбардыроўшчыкі зноў атакавалі англійскія аэрапорты. Загарэліся ангары і склады. Некалькі самалётаў знішчана на зямлі. У Портсмуце моцна пашкоджана буйная электрастанцыя. Пікіруючыя бамбардыроўшчыкі атакавалі ля паўднёва-ўсходняга ўзбярэжжа Англіі 3 англійскіх караваны суднаў, якія ішлі ў суправаджэнні канвоя. Патоплена 13 суднаў агульным танажам у 47 тысяч тон. Дзевяць параходаў пашкоджаны. На працягу дня адбылося некалькі паветраных баёў, закончыўшыхся перамогай германскіх самалётаў. Уночы ў рэзультаце бамбардыроўкі ў Лондане, на прамысловых прадпрыемствах Бірмінгама і Кавентры, а таксама ў парту Ліверпуля ўзніклі многалікія пажары. Бамбардыроўцы падвергліся таксама некалькі прамысловых аб'ектаў і партоў у Шатландыі.

Англійская авіяцыя скінула ўчора бомбы на тэрыторыю Галандыі і Германіі. У Амстэрдаме бамбардыроўцы падвергся лазарэт, у якім было забіта 19 і цяжка ранена 20 салдат. У іншых раёнах налічваецца 7 ахвяр сярод грамадзянскага насельніцтва. Непрыяцельскія самалёты, якія спрабавалі прыблізіцца да Берліна, былі вымушаны ўдаліцца ў паўночным і паўднёвым напрамках. Некалькі самалётаў, дасягнуўшых на вялікай вышыні прадмесцяў Берліна, скінулі на населеныя пункты запальваючыя і фугасныя бомбы. Пашкоджана некалькі дамоў. Адзін лесапільны завод ахоплен агнём. У берлінскую бальніцу імені Вірхова зноў папалі запальваючыя бомбы. Налічваецца многа забітых і раненых.

Учора непрыяцель страціў у паветраным баі 10 самалётаў, германская авіяцыя — 2.

АНГЛІЙСКІЯ ПАВЕДАМЛЕННІ

ЛОНДАН, 2 лістапада. (ТАСС). Як афіцыяльна паведамляецца, учора некалькі злучэнняў непрыяцельскай авіяцыі спрабавалі прабіцца да Лондана, але былі адбіты. Асобным самалётам удалося скінуць бомбы ў некалькіх пунктах Лонданскага раёна, на ўсходніх графствах, у Паўднёва-Усходняй Англіі і ў графстве Лінкольн. *Матэрыяльны ўрон нязначны.* Ёсць некалькі забітых і раненых.

У ноч на 2 лістапада паветраныя атакі непрыяцеля на Англію былі інтэнсіўней, чым раней. На досвітку невялікая колькасць непрыяцельскіх бамбардыроўшчыкаў зрабілі кароткачасовую атаку на Лондан і Паўднёва-ўсходнюю частку Англіі. Некалькі бомб было скінута таксама над адным з раёнаў Усходняй Шатландыі, над двума гарадамі ў цэнтральных раёнах і над некалькімі пунктамі ў раёне ракі Мерсей. Пашкоджаны, галоўным чынам, жылыя дамы. Лік ахвяр невялікі.

Усяго ў баях учора было знішчана 11 непрыяцельскіх самалётаў. Англійская авіяцыя страціла 7 знішчальнікаў.

ЛОНДАН, 2 лістапада. Агенцтва Рэйтэр перадае, што ўчора англійская знішчальная авіяцыя і зенітная артылерыя вялі бесперапынную барацьбу з германскімі самалётамі. Над Англіяй паяўляліся не толькі адзінкавыя самалёты, але і групы, колькасцю ад 20 да 55 знішчальнікаў.

Вайна ў Афрыцы

ЛОНДАН, 2 лістапада. (ТАСС). Афіцыяльна паведамляецца, што 31 кастрычніка італьянская авіяцыя спрабавала бамбардыраваць некаторыя аб'екты ў раёне Мера-Матрух. У баі з англійскімі знішчальнікамі 8 італьянскіх самалётаў было збіта і 4 моцна пашкоджаны. У час гэтага бою 2 англійскіх знішчальнікі сутыкнуліся, але пілоты шчасліва спусціліся на парашутах. Адзін англійскі самалёт быў збіт, другі, які ўдзельнічаў у баі, пакуль не звярнуўся.

Пры налёце англійскай авіяцыі на Гамбат (Лівія) два стаяўшых на зямлі самалёты былі знішчаны, некалькі іншых моцна пашкоджаны. Пры налёце на аэрадром у Менастыры быў разбуран адзін барак і знішчан адзін самалёт. Некалькі бомб упала на мотатранспарт праціўніка, прычыніўшы яму значныя разбурэнні.

Англійскія самалёты бамбардыравалі і абстралялі з кулямётаў буйнае скапленне варожага мотатранспарта ў Чылдзе (на поўнач ад возера Тана). Налётамі на Карора, Мерса-Таклай (Эрытрэя) і іншыя пункты непрыяцелю быў прычынен значны урон.

ЗВОДКА ГРЭЧАСКАГА КАМАНДАВАННЯ

АФІНЫ, 2 лістапада. (ТАСС). Грэчаскае тэлеграфнае агенцтва перадае наступную зводку грэчаскага камандавання аб ходзе ваенных дзеянняў на працягу 1 лістапада.

«На фронце Эпіра адбывалася ажыўленая артылерыйская дуэль. У сектары Фларыны нашы атрады, разбіўшы моцнае супраціўленне праціўніка, пранікл на 5 кіламетраў углыб албанскай тэрыторыі і занялі ўмацаваныя пазіцыі праціўніка. Намі ўзята ў палон 9 афіцэраў і 153 салдаты. Непрыяцельскія самалёты падвергі паветранай бамбардыроўцы і кулямётнаму абстрэлу 15 гарадоў і вёсак. 90 чалавек забіта і 209 чалавек ранена. Разбурана некалькі будынкаў.

Нашы самалёты зрабілі некалькі паспяховых разведчых палётаў і бамбардыравалі з невялікай вышыні аэрадром у Корча і матарызаваныя злучэнні праціўніка на фронце ў Эпіры. Усе нашы самалёты звярнуліся на свае базы. Быў збіт знішчальнік праціўніка, лётчык узят у палон. Другі збіты італьянскі самалёт зваліўся ў размяшчэнні праціўніка».

НАСУСТРАЧ XXIII ГАДАВІНЕ КАСТРЫЧНІКА

Новая тэлефонная станцыя на Беластоцкім вузле

Цяперашняя тэлефонная станцыя Беластоцкага чыгуначнага вузла працуе па сістэме індуктарнай апаратуры МБ (мясцовых батарэй). Кожны тэлефонны апарат пры гэтым жывіцца асобнай батарэяй. Індуктарны выклік прадстаўляе нязручнасці як для кліентаў пры карыстанні тэлефонам,—трэба круціць ручку апарата,—так і для тэлефаністак, якім трэба пры выкліках адкрываць і закрываць клапаны.

Упраўленне Беластоцкай чыгункі выпісала абсталяванне для пабудовы на Беластоцкім вузле новай тэлефоннай станцыі з поўаўтаматычнай апаратурай. Цэнтральная батарэя (ЦБ) будзе жывіць усе апараты станцыі. Абсталяванне зроблена на ленінградскім заводзе «Красная заря».

Новую тэлефонную станцыю ўзяліся абсталяваць самі дзяжурныя механікі станцыі—старшы механік комсамолец Канстанцін Барадаўка, комсамолец Уладзімір Дым, Ульян Арцюшэўскі, Ізмайлаў і Віктар Найда. Маладыя механікі ўзялі абавязацельства — у падарунак XXIII гадавіне Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі поўнасцю абсталяваць станцыю за 20 дзён замест нормы ў два месяцы і здаць яе ў эксплаатацыю напярэдадні слаўнай гадавіны.

Зараз ужо асноўныя работы па абсталяванню новай станцыі закончаны. Змантыраваны кросавая, рэлейная, камутатарная і генератарная ўстаноўкі. 2-га лістапада—рабочая праверка ўстановак, а 5-га лістапада новая тэлефонная станцыя адкрыецца для эксплаатацыі.

Гэта будзе дастойным падарункам маладых энтузіястаў у чэсць гадавіны Вялікага Кастрычніка.

І. Клінаў.

—о—

Перадкастрычніцкае спаборніцтва

КРЫНКІ. (**Па тэлефону**). Калектыў рабочых і служачых скурзавода № 6, уключыўшыся ў соцыялістычнае спаборніцтва за дастойную сустрэчу XXIII гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі, план па выпуску прадукцыі за кастрычнік месяц выканаў на 114,9 процанта. Хромавы цэх завода датэрмінова на 28 кастрычніка вытворчае заданне выканаў на 106 процантаў.

Скурзавод налічвае 106 стаханаўцаў. Стаханавец тав. Іосель штодзённа давау 200 процантаў нормы, а за 1-е лістапада вытворчую норму выканаў на 255 процантаў. Сартыроўшчыца тав. Феро выконвае заданне на 200—225 процантаў, стаханавец-дапрызыўнік тав. Копіль — на 400 процантаў.

Рабочыя абавязаліся праграму IV квартала выканаць да 12 снежня—дня выбараў у Вярхоўны Совет СССР.

На заводзе актыўна разгортваецца работа па выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. Арганізавана 14 гурткоў па вывучэнню Сталінскай Канстытуцыі і выбарчага закона, у тым ліку па аднаму гуртку на польскай і яўрэйскай мовах.

С. Эцін.



У біялагічным кабінеце 16-й польскай сярэдняй школы (г. Аўгустоў).

На здымку: догляд раслін. Фота А. Сапіра.

Мопраўская работа ў Саколкаўскім раёне

У былой панскай Польшчы Саколкаўскі раён быў адным з перадавых па сваіх рэволюцыйных выступленнях супроць панскага гнёту. Рэдка сустракалася вёска, у якой не было-б сялян, пасаджаных у турмы. Адны сядзелі за тое, што вялі барацьбу з тэрорам, другія за тое, што дапамагалі першым. Ведалі рабочыя скурзавода, ведалі сяляне, што азначае МОПР, чаму за прыналежнасць да МОПР'а судзяць на 4—5 год турэмнага зняволення.

У нашай краіне ўсе працоўныя гараць жаданнем дапамагчы сваім братам па класу, якія яшчэ сядзяць за кратамі ў турмах і канцлагерах у капіталістычных краінах. Працоўныя масы Саколкаўскага раёна ведаюць, што кожная капейка, якую яны дадуць МОПР'у, дапаможа выратаваць ад галоднай смерці тысячы вязняў капітала і іх сем'яў. Вось чаму сяляне з вёскі Новаволле прыязджалі за 22 кіламетры ў Саколку і дапытваліся, дзе знаходзіцца райком МОПР'а. Яны хацелі, каб іх запісалі ў члены МОПР'а, каб ім дапамаглі арганізаваць ячэйку МОПР'а ў вёсцы. Многа сялян прыходзіла ў райком з іншых вёсак.

Але работа Мопраўскіх арганізацый у Саколкаўскім раёне на працягу доўгага часу не было наладжана. Жаданні працоўных асталіся нявыкананымі. Райком МОПР'а ў многіх месцах не арганізаваў ячэек. А былы старшыня райкома тав. Паўлоўскі на патрабаванні працоўных толькі адказваў:

— Сёння няма кніжак. Сёння не маю часу. Сёння еду ў вёску па даручэнню райкома партыі і т. д.

Горш таго, ён паехаў у водпуск і нікому не здаў спраў райкома.

Старшынёй райкома назначан загадчык парткабінета тав. Голуб. Але і ён не адразу як належыць *узяўся за работу. Толькі пасля* таго, калі Саколкаўскай раённай арганізацыяй МОПР'а зацікавіліся райком партыі і абком МОПР'а, работа ажывілася. Вялікую дапамогу тав. Голубу аказвае комсамольская арганізацыя раёна. Нядаўна праведзена нарада мопраўскага актыва. Пытанне аб рабоце МОПР'а ўзнімалася і на раённым комсамольскім сходзе. Створаны новыя ячэйкі пры школах, у вёсцы Новаполле і іншых месцах. Зараз мопраўскія арганізацыі Саколкаўскага раёна ўключыліся ў актыўную работу па падрыхтоўцы да выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

С. Панкова-Карловіч.

П А П Р А Ў К І

У нумары 244 газеты «Вольная праца» ад 20 кастрычніка гэтага года пры змяшчэнні пастановы Беластоцкага раённага выканаўчага камітэта аб утварэнні выбарчых акруг па выбарах у раённы Совет дэпутатаў працоўных, дапушчаны недакладнасці па наступных населеных пунктах:

1. Васількоўская выбарчая акруга № 1. Надрукавана: вёска Якімы; трэба чытаць: прадмесце Якімы.

2. Васількоўская выбарчая акруга № 2. Надрукавана: вул. Нова-Гайная; трэба чытаць: Новая, Гайная.

3. Алешкоўская выбарчая акруга № 26. Надрукавана: вёскі Ляцка, Буда; трэба чытаць: Ляцка—Буда.

У газеце № 248 ад 25 кастрычніка пры змяшчэнні пастановы Беластоцкага раённага выканаўчага камітэта аб утварэнні выбарчых участкаў па выбарах у абласны, раённы, гарадскія, сельскія і пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных дапушчаны недакладнасці па наступных населеных пунктах:

1. Бацечкаўскі выбарчы ўчастак № 4. Надрукавана: цэнтр — калгас Бацечкі; трэба чытаць: цэнтр — калонія Бацечкі. Там-жа надрукаваны населеныя пункты: вёска Бацечкі; трэба чытаць: калонія Бацечкі.

2. Чорнавескі Касцельны выбарчы ўчастак № 6. Надрукавана: населены пункт Рыжык; трэба чытаць: Крыжык.

3. Алешкоўскі выбарчы ўчастак № 7. Надрукавана: населеныя пункты Ляцкая, Буда; трэба чытаць: Ляцка—Буда.

Старшыня Беластоцкага райвыканкома А. АКУЛІЧ.

Нам. адказнага рэдактара
Г. М. КУЗНЯЦОЎ.

... Тэлефоны адказнага рэдактара—17-62, адказнага сакратара—49, аддзелаў прапаганды і партыйнага—16-10, эканамічнага аддзела—...